КРЫК ПРАЎДЫ

Цана нумару 500 мар.

АДНАДНЁЎКА

Серада, 20-га сакавіка 1923 г.

Крык праўды.

Польшча была падзеляна, парвана на кусочкі кравасмоктамі-манархамі.

Польшча нясла векамі крыж няволі.

З польскімі сацыялістамі побач працавалі і беларускія народныя змагальнікі за „вашу і нашу волю“.

Польшча ўваходзячы на беларускія землі нясла кліч „роўны з роўным“, кідала салодкія абецанкі.

Польшча цяпер дзеліць Беларускі Народ і ад чаду шовінізма ня бача страшнай судзьбіны быўшых яе гнібіцеляў.

Польскае грамадзянства, ня то, каб спагадаць нашаму зразумеламу яму гору, але паўсямесна сьвяткуе і ўрачыста ўздзевае ярмо Беларускаму Народу, з якім радніліся калісь палякі лёзунгам „за нашу і вашу волю“.

Ні адзін польскі голас пратэсту спачуцьця, перасьцярогі! Наадварот, па ўсіх абшарах беларускай зямлі ідуць масавыя арышты, katаваньне ў нічым нявінных сялян. Выкараняецца, ніштожыцца ўсё беларускае. Трыумфуюць на пакананай стронцы.

Няма з кім гаварыць, няма на каго спадзявацца. Масты спалены.

Трыумф імпэрыялізму.

Польскі імпэрыялізм сьвяткуе пабеду.

Вялікія дзяржавы, якія ў часе сусьветнае вайны ўрачыста абвяшчалі ўсяму сьвету прынцып самаазначэньня нацыянальнасьцей, якія пышаліся тым, што быццам-то ваявалі за „волю народаў“, — цяпер, забыўшыся аб усіх сваіх старых заявах і дэклярацыях, ня менш урачыста прызнаюць за згодны з міжнародавым правам той гвалт над жывым Беларускім Народам, які ўчынілі Польшча і Расея, падзяліўшы між сабой Зямлю Беларускую...

Рада амбасадораў прызнала ўсходнія граніцы Польскага гаспадарства. Гэтым самым прызнала яна аружны захват Польшчай Заходняе Беларусі, прызнала і той фальшаваны „голас насяленьня“, якім зьяўляецца скліканы пад націскам грубой сілы віленскі сойм, зложаны выключна з аднае толькі польскае часткі насяленьня Вільні і суседніх паветаў...

Адна ўжо гэтая пастанова рады амбасадораў раўназначна прызнаньню, што вайна нічога не зьмяніла ў адносінах паміж народамі Эўропы, што гэтыя адносіны і надалей будуць укладацца залежна ад таго, хто з вялікіх дзяржаваў будзе мець аружную перавагу. Гэтая пастанова разьвеяла ўсе лятуценьні аб устанаўленьні доўгага, трывалага міру ў Эўропе; яна—запаведзь новых, страшэнных войн у самым недалёкім часе...

Француская імпэрыялістычная думка пераважыла. І цешацца польскія імпэрыялісты, цешацца пэўне і імпэрыялісты ў варожым Польшчы лагеры—перад усім нямецкім...

Затое сумным адгалоскам адбілася вестка аб пастанове рады амбасадораў у сэрцы кожнага беларуса, які шчыра імкнецца да вызваленьня сваей Бацькаўшчыны. Гарачы пратэст проці надруганьня над нашым прыражоным правам на волю і незалежнасьць рвецца з грудзей усяго Беларускага Народу, што гэтулькі гадоў без аддухі стогне пад чужацкаю ўладаю.

І родзіцца мімаволі пытаньне: няўжо-ж польскі імпэрыялізм запраўды верыць у сваю сілу і ў прыязьнь Францыі?

Няўжо-ж маленачкая Польшча можа рахаваць на тое, што французы датрымаюць ёй веры, калі ў недалёкай будучыне адновяць свой саюз з Расеяй?

Дзікай і сьмешнай выдаецца нам гэткая вера. Дзікай і сьмешнай, бо ўжо ў самым прызнаньні ўсходніх граніц Польшчы можна чытаць між радкоў, што няхай толькі ў Расеі створыцца небальшавіцкі ўрад — хоць бы на безгалоў іэноў вярнуўся тамака царызм, і „дэмакратычная“ Францыя кінецца ёй у абоймы ды гэтак сама прадасьцьць ёй Польшчу, як цяпер прадала Беларусь палякам!

„Хто ваюе мячом, той і сам ад мяча пагіне“.

Прызнаньне ўсходніх межаў Польшчы.

Рада паслоў аканчальна прызнала ўсходнія межы Польшчы. Граніца з Літвою устанаўляецца, згодна з пастановай Лігі Нацый аб разьмежаваньні нэйтральнай паласы; граніцы паміж Польшчаю і Расеею застаюцца, згодна з Рыскім трактатам; Усходняя Галіччына прылучаецца да Польшчы з варункам, што Польшча дасьць гарантыі аб увядзеньні там аўтаноміі і прыме на сябе частку даўгоў б. Аўстрыі, згодна з трактатам у С. Жэрмэн.

Пастанова Рады паслоў выклікала няпакой сярод расейскай, украінскай і літоўскай эміграцыі ў Парыжы. Урад Петрушкевіча зложыў пратэст. З Коўны паведамляюць, што ў Літве гэтая пастанова выклікала страшнае абурэньне. Літоўскі Урад лічыў, што справа будзе разглядацца ў пачатку красавіка. З гэтай прычыны меліся выехаць да Парыжа старшыня Міністраў Гальванаўскас і Смэтона, каб бараніць справу Віленшчыны; люднасьць перакона, што адзіная надзея Літвы ёсьць паразуменьне і супольная праца з Расеяй.

Літоўскі пасол Нарушэвіч зложыў пратэст проціў пастановы Рады паслоў.

Мітрапаліт Шэптыцкі прыбыў да Парыжа і на прыёме у Пуанкарэ горача пратэставаў проціў далучэньня Усходняй Галічыны да Польшчы.

Нота Чычэрына.

Чычэрын выслаў ноту да ўрадаў Англіі, Францыі і Італіі, ў якой адзначыў, што без паразуменьня з Расеяй ня могуць быць вырашаны спорныя пытаньня, ў якіх так ці іначай зацікаўлена Расея і што такая палітыка дае повад думаць, што Антанта ня выраклася сваей варожасьці адносна Расеі. Адсутнасьць прадстаўнікоў Расеі пры вырашэньні такіх пытаньняў, як Клайпэда і Усходняя Галіччына, можа выклікаць новую міжнародную завіруху. Хаця Расея і выраклася ад права да земляў на захад ад лініі Рыскага трактату, тым ня меней яна не перастае цікавіцца лёсам людносьці гэтых земляў, дзяржаўная прыналежнасьць які павіннах быць вырашана згодна з воляй насяленьня гэтых зямель.

Нота Ракоўскага.

Камісар Заграцічных спраў Украінскай Савецкай Рэспублікі выслаў да Польскага Ураду ноту ў справе прызнаньня ўсходніх граніц Польшчы, ў якой катэгарычна пратэстуе проціў усякага урэгуляваньня паміма волі ураду Сав. Украіны тэрыторый, якія беспасрэдна гранічацца з Украінай і маюць з ёю шмат агульных інтарэсаў.

Далей Ракоўскі адзначае, што хаця па Рыскаму міру Украіна і адмовілася ад права да Усходняй Галіччыны, але ў часе мірных перагавораў была пададзена да ведама дэклярацыя Усерас. Цантр. Выкан. К—ту аб тым, каб насяленьню Усходняй Галіччыны была дана магчымасьць свабодна выразіць сваю волю

Факт акупацыі польскімі войскамі і ўладаю Усходняй Галіччыны на 3/4 заселяную украінцамі, заўсёды быў уважаны Украінскім урадам за акт гвалту.

Апрабата Саюзных дзяржаў, якія абвяшчаюць сябе прыхільнікамі права кожнай нацыі на самаазначэньне, ня можа апраўдаць гэтага гвалту, бо 4-х мільённы украінскі народ, які карыстаўся палітычнай, адміністратыўнай і культурнай аўтаноміяй нават пры рэакцыйна-клерыкальнай манархіі Габсбургаў,—воляю Антанты пастаўлены ў варункі шмат горшыя, чым перад вайной.

Украінскаму Ураду вядомы жаданьня Польскага Ураду ператварыць провізарычную акупацыю ў сталую анэксію, але ўвесь сьвет ведае, што насяленьне Усходняй Галіччыны працівіцца ўсімі спосабамі перад гэтым новым гвалтам над сваімі правамі і вольнасьцямі. Байкот выбараў у Польскі Сойм, м а с а в а я эміграцыя з мэтай пазбавіцца прымусовае службы ў польскім войску, частыя паўстаньні, абхопліваючыя цэлыя вокругі Усходняй Галіччыны, усё гэта сьведчыць аб растучым пратэсьце проціў анэксіяністычнай палітыкі Польшчы. Анэксія, якой дамагаецца Польшча, можа выклікаць новыя пратэсты з боку насяленьня Усходняй Галіччыны, а так сама абурэньне работніцкіх і сялянскіх масаў Украіны і Расеі.

Дзеля гэтага Украінскі Урад лічыць за свой абавязак заявіць, што ён будзе лічыць за няважны і ня існуючы ўселякі парадак устаноўлены ў Усходняй Галіччыне без яго папярэджаньня і згоды самаго насяленьня.

Пытаньне аб усходніх граніцах Польшчы.

◆ Саюз Сацыялістычных Рэспублік мае намер склікаць новую канфэрэнцыю, якая павінна заняцца аканчальным вырашэньнем усходніх граніц Польшчы з поўнай згодай Саюзу.

◆ Нямецкая газэта „Vorvärts“ выказывае трывогу аб магчымых новых забурэньняў па поваду далучэньня да Польшчы вялікіх абшараў зямель з няпольскім насяленьнем.

◆ Латвійская газэта „Latvis“ шмат мейсца пасьвячае Віленскаму пытаньню, зазначаючы, што груба мыляецца той, хто думае быццам Клайпэда даражэй Літве як Вільня—ні адзін Літоўскі патрыот не адасьць Вільню за Клайпэду.

Этнографічная мяжа Беларусі на захадзе.

Мяжа беларускага і п о л ь с к а г а прастораў ідзе ад м. Мельніка, што над Бугам, па гэтай рацэ ўніз, пасьля па рацэ Нурцу і далей пераходзе на раку Нарву і Бабёр. Далей мяжа кіруецца на м. Аўгустаў і, падышоўшы да самае нямецкае мяжы пераходзіць пасьля ў край Літоўскі.

„Географія Беларусі“ **Аркадзь Смоліч.**

Нядалая урачыстасьць.

У пятніцу 16 сакавіка адбылося урачыстае паседжаньне Сойму з прычыны прызнаньня Антантаю ўсходніх межаў Польшчы. Прысутнымі былі дыплёматычныя прадстаўнікі бадай усіх дзяржаў, прадстаўнікі прэсы, а так жа і Прэзыдэнт Рэспублікі Войцэхоўскі.

Маршалак Ратай адчыняючы паседжаньне выказаў сваю радасьць з прычыны бязумоўнага прызнаньня ўсходніх граніц. Усе паслы ўстаюць. Сядзяць толькі беларусы і украінцы. Пасол Луцкевіч крычыць з мейсца: „Бяз згоды Украінскага Народу!“ З беларускіх і украінскіх крэслаў чуваць: „Беларускі Народ не прызнаець гэтай граніцы!“ „Для вас радасьць, а для нас жалоба!“

Маршалак звоніць і прызывае да парадку пасла Луцкевіча. Пратэсты сярод беларусаў і украінцаў не спыняюцца. На правіцы і ў цэнтры крыкі: „Выключыць яго,! Вон!“

Маршалак выключае голас Луцкевіча на тры паседжаньня. На правіцы і ў цэнтры гучныя воклясі.

Гэтая рэпрэсыя маршалка выклікае абурэньне сярод беларусаў і украінцаў. Раздаюцца галасы: «Крыўдзіце і пратэставаць не дазваляеце!» „Гвалтаўнікі!“

Пасол Луцкевіч не пакідае салі паседжаньняў і галасна пратэстуе проціў гвалтаў.

Маршалак Ратай ставіць прапазыцыю аб выключэньню пасла Луцкевіча на адзін месяц і гэтая прапазыцыя прыймаецца галасамі ўсіх польскіх партый, выключаючы P. P. S. і нацыянальныя меншасьці.

У знак пратэсту ўсе беларускія і украінскія паслы дэманстратыўна пакідаюць залю паседжаньня. Чуваць галасы: „Няхай жыве Незалежная Баларусь!“ „Няхай жыве самаазначэньне народаў!“ „Няхай жыве незалежная Украіна!“ Выходзячы беларускія і украінскія паслы пагражаюць у бок палякаў Некаторыя з пагрозамі падбягаюць да выходзячых. Ледзь не дайшло да бойкі. Пасол Луцкевіч застаецца на сваім мейсцу.

Маршалак зварочывае увагу п. Луцкевіча на тое, што было б непажадана, каб змушаны быў ужыць сілы для выдаленьня яго з тэй прычыны, што п. Луцкевіч не падпарадкуецца пастанове Сойму.

Ледзь Маршалак скончыў, як да п. Луцкевіча падбегла некалькі эндэкаў і пястоўцаў, адзін хваціў яго за руку, другія абступілі, пагражаючы яму. Па-

сол Луцкевіч спакойна сядзеў ня мейсцы і толькі зьвярнуўся да Маршалка з пратэстам процiў чынімых над ім гвалтаў.

Маршалак забараніў гаварыць Луцкевічу і заявіў, што калі п. Луцкевіч ня пакіне зараз-жа залі паседжаньняў, то ён змусіць яго сілаю. А Луцкевіч на гэта: „У вас заўсёды стасуецца сіла“... і зноў ня парушыўся з мейсца.

Праз увесь гэты час крыкі і шум сярод польскіх паслоў ня спыняліся. Урэшце маршалак даў загад паклікаць стражу, каб вывясьці пас. Луцкевіча і аб‘явіў перарыў на 5 мін. У часе перарыва прыйшло 6 возных. Луцкевіч па добрай волі ня хацеў устаць, дык яго хвацілі пад рукі і за нагі і вынеслі з залі, а Луцкевіч у гэты час сьпеваў па-украінску: „Не пара, не пара москалёві, ляхові служыты“ а пазьней толькі: „не пара, не пара ляхові служыты!“

Пасьля таго, як Луцкевіч быў вынясены маршалак узнавіў паседжаньне З прамовамі выступалі маршалак Ратай і Старшыня Міністраў ген. Сікорскі, ў якіх адзначылі значэньне для Польшчы прызнаньня яе усходніх межаў, пасьля чаго паседжаньне было зачынена.

⁂

Было—сплыло.

Пакуль на ўсходзе Эўропы бурліла рэвалюцыя, дык Польшча вызначала на усходзе свае граніцы як хацела. За гэты час Польшча захапіла значную частку беларускіх зямель, разумеецца, без згоды і процiў волі пасяленьня, але з „благаславеньня“ Антанты, якой патрэбна было каб Польшча спыняла рэвалюцыйны імпэт бальшавікаў на захад і каб пагражала Нямеччыне.

Але цяпер калі бальшавікі узмацоўваюцца і наладжываюць сваё жыцьцё так, што з імі пачынае лічыцца Антанта і уваходвіць у гандлёвыя зносіны (аб зблiжэньні з Савец. Рэспублікамі нават загаварылі і французы) і калі Нямеччына аслаблена, дык Польшча робіцца што раз меней патрэбна для Антанты а нават будзе перашкаджаць сваімі дамаганьнямі на непакорныя „Kresy“

Доказам гэтага служыць прайграная Польшчай справа Клайпэды. А ўсе социялісты Заходняй Эўропы воража настраены процiў імпэрыялістычнай палітыкі яе. Нават францускія социялісты галасавалі процiў выдачы 400 міл. пазычкі для Польшчы Туманнае прызнаньне ўсходніх граніц ёсьць часовая і мо апошняя удача польскай палітыкі на Захадзе. Палякі куюць пакуль горача.

⁂

Украінскія дэманстрацыі ў Львове процiў прызнаньня ўсходніх граніц.

У нядзелю кс. Джэнокі адслужыў набажэнства ў уніяцкай катэдры сьв. Юры. Пасьля набажэнства кс. Джэнокі меў казаньне да сабраўшайся на дзядзінцу катэдры людпасьці з балкону палаца мітрапаліта. Пасьля казаньня на балкон узышоў пасол М. Луцкевіч і сказаў гарачую, падбураючую прамову.

Пасьля прамовы зарганізаваўся паход з царкоўным брацтвам на чале. Паліцыя аддзяліла брацтва ад рэшты людпасьці і працэсыя пашла да места, а рэшта была адціснута на дзядзінец сьв. Юры. Тут дэманастранты пачалі кідаць каменьнямі ў бок паліцыі і бэсьціць паліцыянтаў. Паліцыя захоўвалася спакойна і дэманстранты ўсё болей кідалі каменьнямі, ранячы некалькі паліцыянтаў. Паліцыя арыштавала 10 асоб, ў тым ліку некалькі кабет. Демантранты мелі замер ісьці ў цэнтр горада, дзе адбываўся вайсковы парад.

⁂

„Агляд баевое дзейнасьці на украінскіх землях, занятых праз Польшчу за 1922 г.“.

Пад гэткім загалоўкам была выдадзена украінская публікацыі, аб якой „Reczpospolita“ №75, перадруковываючы з „Kurjera Lwowskiego“, паведамляе:

„Насамперш брашура ўспамінае а заданьнях дзейнасьці, якімі зьяўляюцца 1) ніштажэньне польскіх двароў з мэтай паказаць польскім земляўласьнікам, што маемнасьць іх на Украіне ня ёсьць пэўнаю, 2) падпаляньне і акты сабатажу з мэтай запужаць польскую людпасьць, 3) ніштажэньне калянiстаў і фальваркаў з мэтай адстрашыць польскіх сялян ад калянізацыі, 4) байкот выбараў...

Далей абраз бітваў, адмаляваны ў камунікаце ў цыфрах: спалена двароў 94 (няўдалося спаліць 9), сялянскіх гаспадарак 54 (неўдалося 1), забіта вайсковых палякаў і цывільных 22 (неўдалося—11), забіта ўласных (украінцаў-здраднікаў) 13, актаў сабатажаў дзяржайнай маемнасьці 60 (неўдалося 8)... Страты прычынена на 800.000 даляраў,

Далей аблічаюцца ўласныя страты: 9 нападаў польскіх баёвак прычыніў шых страт на 27.000 даляраў. Разстрэляна 6 украінцаў. Забіта ў часе баёў 22. Арыштазана польскімі ўладамі 1671, з якіх пасаджана ў вастрог 1508. Цяпер большасьць іх ўжо звольнена. Па прыгавару судоў пасаджана ў вастрогі 10 асоб“.

Мала фактау.

На канфэрэнцыі сонца, волі і каханьня
У пытаньні пра людзкое бытаваньне
Была слухана ўсімі дэклярацыя
Душы беларускае нацыі,
Дзе пачулі: „Як Спажой цукроўка я дасьпела,
З Буга на Няпро лётаць магу сьмела,
Цэнзар, кайданы гэта справа цела.
Мне падзел—нішто, глупства меж разбежнасьць—
Прашу вас прызнаць маю незалежнасьць“.
Высокія асобы развaжалі гэтак:
— Лётаць бадай лепш ужо напасьледак.
Перш трэ навучыцца хадзіць сьмела, цьвёрда
Праз усе прашкоды, прабіваць іх горда.
Душа ў неба лётаць можа толькі з раю,
А ты з пекла прэшся—так не выпадае.
Пасьля няўцямна гэтых дум сумежнасьць:
Нявольная залежнасьць і ў ёй незалежнасьць!

А вось і ўхвала:
Справу адлажыць, бо фактаў йшчэ мала.

Ж.

⁂

Паліласе кроў.

У нямецкай краіне Рур, занятай францускіні акупантамі, ужо палілася кроў. Тэрор якім послугуюцца мусіў адклікнуцца возгаласам з боку немцаў. Ужо ад неякага часу у заняты французамі край перабіраліся тайна аружныя нямецкія студэнты і рабтнікі, якія і пачалі сваю дзейнасьць. Калі францускія жаўнеры арыштавалі некалькі немцаў дык насяленьне стала ў іх абароне—дайшло да таго што жаўнеры забілі некалькі немцаў. Гэта—пачатак. франыузы пагражаюць рэпрэсыямі, а з другога боку немцы пачаўшы будуць канчаць.

Такім чынам вельмі магчыма, што ў Руры разгарыцца крывае паўстаньне

⁂

На беднага Макара ўсе шышкі сыпяцца.

Дзеля таго, што мы не арганізаваны і ня маем моцнага кулака, дык з намі робяць, што хочуць і крыўдзяць, як умеюць. Ужо, здаецца, адных асаднікаў хапае, каб атруціць нам жыцьцё, дык не, вынесена новая пастанова, каб палякаў, якія вертаюцца з Сібіру, надзяляць землёй з Kresów Wschodnich Чаму іх не надзяліць зямлей абшарнікаў з тых месц, з якіх яны родам?

Адным словам, куды ня кінь усюды клін.

⁂

З Менску.

— **К.** Канчар напісаў эканамічную географію Беларусі. Кніга будзе мець да 20 друкованых аркушаў.

— М. Пятуховіч падгатаваў да друку том крытычных нарысаў беларускае літэратуры, у які вайшлі крытычныя разгляды шасьці беларускіх песьняроў і пісьменьнікаў, як Янка Купала, М. Чарот і інш.

— З. Бядуля канчае апрацоўку „Гісторыі беларускага тэатра“. Для выданьня працу гэту ад аўтара набывае Інстытут Беларускае Культуры.

⁂

ДОПІСЫ.

Юрацішская гм.

У вёсцы Чарнелі асаднікі з маёнтку Бокшышкі разагналі вясельле, пабіўшы усіх гасьцей і навет гаспадара Антона Паўмокоўскага і маладога Юрку Барысэвіча.

У весцы Ляпешках хацелі разагнаць вечарыну але атрымаўшы па загрыўку пусьціліся на ўцекі.

У веcках Грушэнцы і Чашэйкі пазьбівалі і паразганялі гойсьцей.

У м. Трабах гаспадар вёскі Барушкі, Альшэўскі прадаў за 1 000.000 марак карову і добра захаваўшы грошы, паехаў да хаты. За мястэчкам, на дарозі яго апанавалі асаднікі і хацелі адабраць іх, паліцыянты, паведамленыя аб гэтым нейкім хлапчуком, абаранілі Альшэўскага, у якога налічана 12 нажавых ранаў.

Арыштованых асаднікаў праз поўгадзіны выпусьцілі.

Што дня на станцыі Юрацішкі робіцца нагрузка рожных матэр‘ялаў. На гэту работу забіраецца так многа сялян, што пе хватае навет пагрузаючых вагонаў. Дзеля таго, каб захваціць такі вагон, пускаюцца ў ход ня толькі кулакі, а і тапары, што мела мейсца ў апошнія часы. Так, сяляне з вёскі Корніненты і Дарэні не пазадзілі Каб вырашыць спорку пусьцілі ў ход тапары. Толькі дзякуючы ж. д. адміністрацыі удалося бойку стрымаць, ахвярай якой стаўся толькі Юрка Зянюк: разьбіты пальцы на руках і пабіта галава.

У мястэчку Трабах у шынку на грамадзян вёскі Загорцы Антона і Янку Альшэўскіх — бацьку і сына, без дай прычыны, напалі асаднікі м. Бокшышкі. Бацьку выкруцілі правую руку, а сыну паранілі нажамі плячо і рукі. Абое сёмую нядзелю хвараюць. Sędzia pokoju прыгаварыў асаднікаў на 5 дзён арышту кожнага.

Скора, справядліва і міласьціва, але не для нас беларусаў.

К. Сьвет.

⁂

БЕЛАРУСКІ ПАКАЗАЛЬНІК.

Віленская Беларуская Гімназія (8 клясау) — Вострабрамская вул., 9.
Беларускае Навуковае Т-ва—Вільня Віленская 8.
Віленскі Беларускі Музыкальна - Драматычны Гуртон — Біскупская № 12-6.
Беларуская Урадовая гімназія Daugavpils Varsava iela 16.
Рыскі аддзел Беларускага Культурна-Прасьветнага т-ва „Бацькаушчына“ — Łatwija, Riga, Nikołaj ul‘a 20 dz. 1.
Беларускае Культурна Прасьветнае т-ва „Бацькаушчына“ у Латгаліі — Łatwija, Riga, Witebskaja, 16.
Люцынскі Аддзел Беларускага Культурна Прасьветнага т-ва „Бацькаушчына“ у Латгаліі — Łatwija, Lucyn Sjebeżskaj 66.
Рада Беларускай Калеції у Латвіі. — Łatwija, Riga, Bulw. Totlebena, 7-3.
Навагрудзкая Беларуская Гімназія Навагрудак.
Нясьвіжская Беларуская Гімназія Нясьвіж.
Беларускае Выдавецкае т-ва Вільня, Віленская 8.
Таварыства Беларускае Школы і Цантральная Беларуская Школьная Рада Вільня, Віленская 12
Беларуская Кнігарня — Вільня, Завальная вул. 7.
„*Беларускі Звон*“ Вільня, Вострабрамская вул 9-23.
Беларускае Прэс-Бюро у Рэвалі — Europa. Estonija. Rewal. Post-Kast 153, Biełaruskaje Press-buro.
Белар. Аддзел пры Мініст. Прасьветы у Латвіі — Łatwija, Riga, Nikolaja eela 36 a.
Weis ruthenisches Presburo — Dancig, 1, „seutm 11“.
Беларускі Студэнскі Саюз — Віленская вул. 12-6.
Беларускі пасольскі клюб. Warszawa, Sejm Rzeczypospolitej.
Сэкрэтарыяты Беларускага Пасольскага Клюбу
1) Вільня, Віленская вул. № 12. кв. 6.
2) Горадня, Мастовая 9.
3) Воукавыск, Пяскoвая 14. У гэтых сэкрэтарыятах паслы прыймаюць кожную нядзелю ад 10 да 1 г.
4) м. Крынкі Горадзенскага павету. Гродненская вул., № 34
5) м. Саколка. Гродненская вул., № 34.
6) м. Клешчэлі Бельск. павету. вул. Коперніка, № 4.
7) Бельск. Замкавая вуліца д. № 3, намяшканьне 1. Сэкрэтаром Канстанцін Карыцкі.
8) м. Глыбокае Дзісьненскага павету, вул Сенкевіча № 46.
9) Жодзішкі, Сьвенцянскага п. кс. Годлеускі.
10) Баранавічы.
11) Столбцы.
12) Несьвеж.
13) Ліда, II Слабодка № 8 сэкрэтар Калясінскі.
14) Навагрудак, Вялікі Рынак 14. сэкр. Ян Біруковіч.
15) Нясьвіж, Альбянская 28, сэкр. Я. Шнаркевіч.
Беларускі Цантральны Камітэт помачы пацярп. ад вайны. Вільня, Віленская, 12, 6.
Віленскі Беларускі Камітэт помачы пацярп. ад вайны. Вільня, Вострабрамская 9-24.
Горадзенскі Бел. Кам помачы пац. ад вайны. Горадня, Мастовая, 9.
Беларуская Драматычная Майстроўня Вільня, Вострабрамская, 9.
Беларускі прытулак. Вільня, Вострабрамская, 9.
Беларускі Жаночы Гуртон. Вільня, Вострабрамская, 9.
Эміграцыйнае бюро у Гданску. Gdańsk III. Damm II. Weis-ruthenische Informationsbüro.
«*Маладое Жыцьцё*» Вільня, Вострабрамская, 9.
„*Наш Шлях*“ Вільня, Віленская, 12.
„*Беларускі Сьцяг*“ Літва. Kaunas, Senatoriqu 9 - 8.
Беларускі Музэй. Вільня, Вострабрамская, 9.
Віленскі Саюз Каапэратываў Вільня, Малая Погулянка 12.
Сэкцыя Беларусаў пры Украінскай Студэнцкай Грамадзе. Warszawa Długa 29 Hotel „Polski“ m. 11.

Зварочуемся да ўсіх беларускіх арганізацый на сьвеце з просьбаю — прысылаць у гэты аддзел сваё адрасы.

Беларусы! Чытайце, распаўсюджывайце і складайце ахвяры на свае газэты!

У нашай сьвядомасьці — наша моц!

Выдавец ЛЯВОН КУДЛЕУСКІ, Вострабрамская 19—6. Друкарня С. Бэккера, Субач, 2.